раздзелы трылогіі. Апошняе, здаецца, “не блещет” <…> Апавяданні лепшыя. А наогул – цудоўны стары. Сядзеў я аднойчы ўвечары ў добрым настроі і прыемна ўяўляў сябе на трыбуне, дзе зачытваю прывітанне яму ад маладых празаікаў, у сувязі з яго сямідзесяцігоддзем. І што абсалютна прыемна – многія яго віталі б з той жа радасцю» (успаміны 1952 года) [1, с. 177–178].

У якасці высновы хочацца падкрэсліць ролю нараталагічнага аналізу тэкстаў, якія, на першы погляд, не вылучаюцца актыўнай падзейнасцю. Так, лірычныя запісы і мініяцюры Я. Брыля можна ўспрымаць як звычайную фактаграфію, аднак пры нараталагічным прачытанні раскрываюцца спецыфічныя прыёмы літаратурнай творчасці ў яе скіраванасці да камунікацыі з чытачом. Менавіта гэтыя прыёмы дазваляюць убачыць асобы Янкі Купалы і Якуба Коласа праз эмацыянальнае і рацыянальнае ўспрыняцце Янкі Брыля.

### Бібліяграфічны спіс

1. Брыль, Я. Збор твораў: у 10 т. / Я. Брыль. – Мінск: Маст. літ., 2020. – Т. 6: Лірычныя запісы і мініяцюры 1945–1992. – 798 с.

2. Мушынскі, М. І. Свайму часу і вечнасці: зб. арт. / М. І. Мушынскі. – Мінск: Беларус. навука, 2021. – 480 с.

3. Сінькова, Л. Д. «Непрыдуманая літаратура»: факт і мастацкі вымысел у літаратурным творы / Л. Д. Сінькова // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 750-годдзя з дня нараджэння Дантэ Аліг’еры і 85-годдзя Уладзіміра Караткевіча: матэрыялы XII Міжнар. навук. канф., Мінск, 22–24 кастр. 2015 г.: у 2 ч. / Беларус. дзярж. ун-т; рэдкал.: пад рэд. Г. М. Бутырчык. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2015. – Ч. 1. – С. 40–47.

*УДК 821.161.3(092 Я. Купала)*

## ПРЫЖЫЦЦЁВЫ ВОБРАЗ-ІМІДЖ ЯНКІ КУПАЛЫ Ў ПЕРЫЯДЫЧНЫМ ДРУКУ БССР 1920–1930-х гг.

**К. А. Крыцук-Тарасава**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*katsyarina_tarasava@mail.ru*

У артыкуле зроблены кароткі аналіз публікацый перыядычнага друку БССР 1920-х – 1930-х, якія рэпрэзентуюць асобу Янкі Купалы. У выніку аналізу былі вызначаны асноўныя сродкі стварэння вобраза пісьменніка, асноўныя іміджавыя стратэгіі і заканамернасці іміджмейкінгу аўтара.

*Ключавыя словы:* Янка Купала; імідж пісьменніка; іміджмейкінг; вобраз аўтара.

## THE YANKA KUPALA’S LIFETIME IMAGE IN THE PERIODICAL PRESS OF THE BSSR IN THE 1920s – 1930s.

**K. A. Krytsuk-Tarasava**

*Belarusian State University*
*Minsk, Republic of Belarus*
*katsyarina_tarasava@mail.ru*

The article provides a brief analysis of the publications of the BSSR periodicals in the 1920s and 1930s that represent Yanka Kupala’s personality. As a result of the analysis, the main means of creating the writer’s image, the main image strategies and patterns of the author’s image-making were defined.

*Key words*: Yanka Kupala; the image of the writer; image making; image of the author.

У эпоху кліпавага мыслення і прагматызацыі літаратуры ўсё большую ролю ў развіцці літаратурнага працэсу пачынае адыгрываць імідж пісьменніка: а) той вобраз літаратара, які складваецца ў публічнай прасторы дзякуючы трактоўкам яго тэкстаў, прэзентацыі яго асобы і творчасці ў сродках масавай інфармацыі (СМІ), а таксама ацэнкам яго знешнасці і манеры паводзін, гісторыі стасункаў з творчым асяроддзем і блізкімі людзьмі; б) у выніку намаганняў самога пісьменніка фарміраваць тыя ўяўленні пра сябе, якія ён лічыць патрэбнымі (г. зн. у выніку свядомага выбару аўтарам пэўных стратэгій для ўласнага іміджмейкінгу).

Зразумела, што ў часы Расійскай імперыі і СССР такіх тэрмінаў, як «імідж», «іміджмейкінг» [4], [3] або «габітус», «пазіцыяванне», «сімвалічны капітал» [2] яшчэ не было ва ўжытку, але амаль аналагічныя паняцці пра рэпутацыю, аўтарытэт, статус творцы-мастака заўсёды былі вельмі істотнымі і значнымі ў літаратурным асяроддзі. Сам працэс фарміравання вобраза пісьменніка дакладна прасочваецца з самага пачатку існавання Савецкага Саюза, дзе пісьменнікі разглядаліся як лідары меркаванняў і рупары народнай думкі. Асноўнымі пляцоўкамі для стварэння вобраза-іміджу беларускіх пісьменнікаў станавіліся перыядычныя выданні. Аналіз беларускага друку дае нам магчымасць даследаваць ранні іміджавыя стратэгіі, характэрныя для айчыннага літаратурнага працэсу, звязаныя, у прыватнасці, са стварэннем публічнага вобраза-іміджу Івана Дамінікавіча Луцэвіча – славутага Янкі Купалы.

Івана Луцэвіча – Янку Купалу можна лічыць адным з самых яскравых прадстаўнікоў нашаніўскага і ранняга савецкага перыядаў. Яго вобраз-імідж актыўна развіваўся ў перыядычным друку і Заходняй, і Савецкай Беларусі. Публікацыі самога Купалы і тэксты пра яго часта з'яўляліся ў выданнях «Маладняк», «Рунь», «Авадзень», «Досвіткі», «Полымя», «Беларусь калгасная», «Калоссе», «Беларускі летапіс», «Работніца і калгасніца Беларусі» і іншых. Купала лічыўся таксама рупарам беларускай народнай, нацыянальнай, а ў далейшым – і савецкай ідэі.

Так, у адным з першых нумароў часопіса «Маладняк» [9, с. 10] прадстаўлены верш Янкі Купалы «Арлянятам». Верш заклікае да актыўных дзеянняў маладое пакаленне беларусаў, а таксама выказвае надзею на светлую будучыню моладзі.

У дадзеным выпадку імідж аўтара фарміруецца некалькімі сродкамі. Першы сродак – выкарыстанне фота аўтара. Выкарыстанне фота аўтара фарміруе габітусны і кінетычны імідж, які ў сваю чаргу ўплывае на ўспрыманне вобраза пісьменніка. На фота Янка Купала прадстаўлены ў пінжаку, кашулі і гальштуку, што фарміруе вобраз сталага і самавітага чалавека. Яго позірк накіраваны паўз чытача і нібыта ўбок, што дадае вобразу аўтара задуменнасці, узвышанасці.

Таксама на фарміраванне іміджу аўтара ўплывае кампазіцыйнае рашэнне рэдакцыі. У выданні верш Янкі Купалы стаіць самым першым мастацкім творам у спалучэнні з матэрыяламі Цішкі Гартнага і Змітрака Бядулі – пры тым, што яны, старэйшыя, не адносіліся да літаратурнага пакалення «Маладняка» (хоць Бядуля горача падтрымаў моладзь і нават увайшоў у склад гэтага аб'яднання). Прычым усе творы на старонцы часопіса носяць характар настаўлення маладому пакаленню, што стварае ўражанне, нібыта гэтыя аўтары адкрываюць, благаслаўляюць, настаўляюць рэдакцыю і чытачоў часопіса. І калі ўлічваць апісаныя акалічнасці, то першынства Янкі Купалы сярод пісьменнікаў указвае на яго большую значнасць, важнасць для літаратурнага пакалення. Што ў сваю чаргу стварае яго імідж, як ужо сталага і паважанага пісьменніка.

У «Маладняку» № 2 ад 1924 года [12, с. 11] быў надрукаваны верш Янкі Купалы «Вам на памяць Серп і Молат…». Гэты верш, як і папярэдні прыклад, мае заклік да актыўных дзеянняў і актыўна падтрымлівае беларускую моладзь. Таксама верш знаходзіцца ў самым пачатку нумара – адразу пасля публіцыстычнай часткі – і ўжо асобна ад іншых вершаваных твораў. Графічнае афармленне верша вылучаецца і не мае прамой сувязі з асобай аўтара.

Адзначаецца паўтор ранейшага кампазіцыйнага прыёму і тэматычнае падабенства твораў Янкі Купалы, якія друкаваліся ў «Маладняку». Гэта ў першую чаргу сведчыць пра пастаянства ў стаўленні маладога пакалення да паэта, а таксама пра значнасць яго заклікаў і парад, павагу з боку стваральнікаў выдання.

У гэтым жа годзе Янка Купала выступіў у друку ў часопісе «Полымя». У «Полымі» № 2 ад 1924 года было надрукавана адразу некалькі яго твораў: нізка вершаў «Безназоўнае» [10, с. 22]

і п’еса «Тутэйшыя» [23, с. 34]. Па колькасці і аб’ёме твораў можна сказаць, што творы Янкі Купалы займаюць у выданні найбольшую колькасць старонак. Нават у параўнанні з нізкай вершаў Цішкі Гартнага «З цыклю “Горад”» нізка «Безназоўнае» займае плошчу, якая ледзьве не ўдвая перавышае плошчу першай нізкі. Гэты паказчык указвае на тое, што творчасць Янкі Купалы высока ацэньвалі ў рэдакцыі выдання. Бо для чытача вялікая плошча для аўтара ў выданні сведчыць пра яго значнасць.

Таксама іміджаўтваральным сродкам выступае кампазіцыя. Нізка вершаў Янкі Купалы стаіць першая ў раздзеле паэзіі, і далей п’еса «Тутэйшыя» з’яўляецца адзіным творам у раздзеле драматургіі. Як і ў ранейшых выданнях, вынясенне аўтара ў пачатак раздзела / рубрыкі акцэнтуе на ім увагу, асабліва калі разам з гэтым сродкам выкарыстаны яшчэ нейкія.

Працяг п’есы «Тутэйшыя» распачынае і № 3 часопіса «Полымя» ад 1924 года: пад яго аддадзена 35 старонак выдання [24, с. 3]. Гэтак жа распачынае і нумар 4 часопіса «Полымя» верш Янкі Купалы «Наш летапісец» [17, с. 17]. Гэтыя даныя пацвярджаюць раней вызначаныя ацэнкі рэдакцыі ў дачыненні да Янкі Купалы.

Таксама ў 1924 годзе вершы Янкі Купалы выходзілі ў часопісе «Беларуская работніца і сялянка». У № 1 часопіса ад 1924 года быў надрукаваны яго верш «Дзве сястры» [13, с. 17]. У вершы аўтар падтрымлівае беларускіх жанчын і заклікае іх да новага жыцця, іншай працы, светлай будучыні. Праз тэматыку і характар вершаў мы бачым, што Янка Купала падтрымліваў неабароненыя часткі грамадства: моладзь, жанчын, беднякоў. Гэтая тэматычная і адрасная скіраванасць дадае іміджу Янкі Купалы дадатковую асяроддзевую вагу. Янка Купала выглядае як чулы, шчыры, добры чалавек, які імкнецца ўсім дапамагчы, абудзіць народныя масы.

Да таго ж, кампазіцыйна верш зноўку распачынае літаратурна-крытычны раздзел, што ўказвае на раней апісаныя асаблівасці стаўлення рэдакцыі да аўтара.

У газеце «Радавая рунь» № 1 ад 1924 года на першай паласе выдання быў надрукаваны верш Янкі Купалы «Крым» [15, с. 1]. Як і ў ранейшых выпадках, кампазіцыйнае акцэнтаванне ўказвае на значнасць і важнасць пісьменніка і яго творчасць.

У 1925 годзе вершы Янкі Купалы пачалі з’яўляцца ў выданні крытыкі, жартаў і смеху «Авадзень». Так, у выданні № 1 ад 1925 года быў надрукаваны верш Янкі Купалы «Святая праўда». Верш носіць гумарыстычны характар і аднесены да рубрыкі «“Цымус” са старых друкаў» [22, с. 3].

Іміджаўтваральным у дадзеным выпадку выступаюць выданне, рубрыка і верш. Публікацыя менавіта ў гэтым выданні стварае дзелавы імідж аўтара, паколькі ўплывае на яго ўспрыманне ў грамадстве. Калі раней мы сутыкаліся з вобразам Янкі Купалы як увасабленнем самавітага паэта-настаўніка, то зараз сам характар выдання змяняе яго, надаючы яму дадатковыя рысы дэмакратычнасці і гуллівасці. Хоць нельга сказаць, што надрукаваны верш не мае дыдактычнага або крытычнага падтэксту. Верш апісвае цалкам магчымую ў рэальным жыцці сітуацыю, якую прадстаўляе адначасова і ў крытычным, і ў гумарыстычным выглядзе.

Найбольш іміджаўтваральнай у выданні выступае рубрыка і кампазіцыя. Кампазіцыйна твор Янкі Купалы нічым не вызначаны і не аформлены візуальна. У такім выглядзе ён уяўляе сабой шараговы твор, як і твор любога іншага аўтарства, асоба Янкі Купалы тут ніякім чынам не падкрэслена і не адзначана, што паказвае на нязначнасць, звычаёвасць гэтай публікацыі і яе аўтара.

У рубрыцы «“Цымус” са старых друкаў» выкарыстана слова «цымус», якое ўвайшло ў гаворку мястэчковых беларусаў з ідыша, дзякуючы стасункам з даўнімі суседзямі-яўрэямі. Гэтае слова мае значэнне са станоўчымі канатацыямі: усё добра, добрая якасць, самая сутнасць і іншыя. Але ў рубрыцы яно ўзята ў двукоссе, што ўказвае на антанімічнае значэнне слова ў дадзеным кантэксце: найгоршае, не тое, што трэба. У спалучэнні з іншымі словамі рубрыкі атрымліваецца, што ў ёй надрукавана крытыка «найгоршага», «не таго, што трэба» са старых друкаў. Паводле зместу рубрыкі можна сказаць, што рэдакцыйны склад дараўняў верш да анекдота. Трэба адзначыць, што ў выданні амаль цалкам адсутнічаюць імёны аўтараў або тэксты падпісаны псеўданімамі. Але аўтарства верша Янкі Купалы ўказана, што можна ацаніць як знак павагі да паэта.

У 1926 годзе вершы Янкі Купалы з'явіліся на старонках выдання «Чырвоны сейбіт». Так у першым нумары выдання быў апублікаваны яго твор «Нікому» [19, с. 2]. Верш, як і раней, размешчаны першым з мастацкіх твораў, адразу пасля прадмовы Адама Бабарэкі аб тым, якім павінна быць сапраўднае мастацтва. Падобная паслядоўнасць яшчэ больш падкрэслівае значнасць і ўзровень паэзіі Янкі Купалы, бо ў самім тэксце крытык апісвае сапраўднае мастацтва словамі: *вышэйшае*, *культурны капітал*, *высока каштоўныя творы* і іншыя. Такім чынам паляпшаецца і імідж Янкі Купалы, творчасць якога ацэньваецца найвышэйшым чынам, а магчыма і выступае як дапаўненне, ілюстрацыя артыкула Адама Бабарэкі.

Цікавым было з'яўленне Янкі Купалы ў альманаху «Надзвінне» 1926 года выхаду. У выданні быў змешчаны верш паэта «Акоў паломаных жандар…», а таксама яго адкрыты ліст да палачан [8, с. 7]. Гэты твор быў адказам на выступленне ў друку полацкіх шавіністаў супраць беларускай мовы.

Наступным ідзе прамы зварот Янкі Купалы да жыхароў Полаччыны. У ім ён адкрыта ўхваляе іх гасціннасць і шчыры прыём, а таксама заклікае да развіцця беларускай мовы, культуры і літаратуры, абапіраючыся на іх славутага земляка Францыска Скарыну. Падобны зварот вельмі добра ўплывае на імідж пісьменніка, бо выяўляе адкрытасць і камунікатыўнасць паэта, а таксама яго набліжанасць да народа. Купала з павагай называе канкрэтных асоб – членаў урада (Адамовіча і Баліцкага). Падобнага роду зварот да палачан адразу павялічвае дзелавы імідж паэта пры дапамозе метаду пазітыўнага настрою, у якім выказваецца станоўчае стаўленне або выказваецца ўхваленне да пэўнай сацыяльнай групы. Таксама такім чынам аўтар выказвае сваю грамадзянскую пазіцыю, што, ізноў жа, уплывае на яго асяроддзевы і дзелавы імідж. Гэта публікацыя паўплывала і на габітусны імідж, бо да публікацыі быў далучаны фотаздымак пісьменніка. Сам фотаздымак выяўляе яго як сур'ёзнага, упэўненага ў сабе, самавітага чалавека. Дапамагае сфарміраваць такое ўспрыняцце яшчэ і кінетычны вобраз – устойлівае становішча Янкі Купалы на фотаздымку. Кампазіцыя выдання адыграла ролю, тоесную раней апісаным выпадкам.

У 1926 годзе Янка Купала выступіў у перыядычным друку часопіса «Маланка» № 6 з вершам «Памяці Шаўчэнкі» [21, с. 2]. Верш быў прысвечаны гадавінам дня нараджэння і смерці Тараса Шаўчэнкі. У самім вершы Янка Купала апісвае Тараса Шаўчэнку як песняра свабоды і народа, што ў некаторай ступені фарміруе і яго вобраз, бо тыя рысы, на якіх ён акцэнтуе ўвагу ў творчасці Тараса Шаўчэнкі, адлюстроўваюць і яго аксіялагічную сістэму, што стварае яму імідж свабоднага народнага паэта.

Асаблівую ўвагу трэба надаць выданню «Маланка» за 1927 год (гэта час, калі Янку Купалу пачалі ўжо абвінавачваць у недастатковай лаяльнасці да ўлады), у прыватнасці – № 3. На адной з першых старонак апублікаваны верш «Ці то – здольны пясняр, ці то – модны пляткар…» Кандрата Крапівы [5, с. 2]. Адрасат верша не ўказаны. Хутчэй за ўсё, маецца на ўвазе крытыка маладнякоўцаў. Але, на маю думку, маюцца таксама значныя сімвалы-знакі, якія ўказваюць на тое, што верш адрасаваўся і Янку Купалу. На гэта ўказвае, па-першае, найменне народнага песняра. Творчасць Янкі Купалы заўсёды была прызначана для сялян і ўсяго беларускага народа, і ў той перыяд не было паэта больш «сялянскага», чым Янка Купала. Па-другое, выраз «заяўляе пратэст» указвае на адну з асаблівасцей творчасці паэта, яго імкненне да нацыянальнага адраджэння, свабоды і рэвалюцыі. «І ў людзей-чытачоў просіць помачы» – яшчэ адзін знак, уласцівы творчасці Янкі Купалы – заклікі, якія Кандрат Крапіва трактуе як просьбы. Змест тэксту не ўплывае непасрэдна на імідж пісьменніка, але дае магчымасці да трактавання верша на адрас Янкі Купалы, што, трэба лічыць, наносіць шкоду дзелаваму іміджу паэта. Верш дыскрэдытуе тыя мастацкія сродкі і ідэйны змест, якія асацыююцца са стылем Купалы, фактычна прыніжаючы ўсю яго творчасць.

У 1930 годзе Янка Купала выступіў у друку ў газеце «Чырвоная Беларусь», дзе з'явіўся яго верш «Дыктатура працы» [14, с. 11]. Верш ніякім чынам не адасоблены і размешчаны ў сярэдзіне выдання. Сам верш носіць агітацыйны характар і падтрымлівае савецкую ідэалогію, не мае лакальнага звароту да вузкіх сацыяльных груп і, меркавана, меў нейтральны ўплыў на дзелавы імідж паэта і адмоўны на асяроддзевы. Гэта звязана з абвастрэннем працэсаў палітычных

рэпрэсій, і беларуская інтэлігенцыя да гэтага часу паступова пачала адыходзіць ад публічнага сцвярджэння нацыянальных ідэй у паэзіі, бо яны замяняліся пафасам інтэрнацыяналізму.

У другім нумары гэтага ж выдання пісьменнік выступіў з вершам «Беларускаму дзяржаўнаму выдавецтву 1924–1925» [11, с. 13]. Як і ў ранейшым нумары, верш ніякім чынам не вылучаны і амаль не прадстаўляе асобу аўтара. З вершаў знікла пазіцыя аўтара, яны сталі больш схематычныя, менш вобразныя. Падобная тэндэнцыя сведчыць пра тое, што асобу і пазіцыю аўтара спрабуюць нівеляваць, прыбраць. Зрабіць асобу паэта больш службовай, што адмоўна ўплывае на яго імідж, бо знікае сам суб'ект іміджмейкінгу.

З літаратурных частак выданняў знікае асоба Янкі Купалы, і яго вершы з'яўляюцца ўсё часцей у газетах толькі ў выглядзе агітацыйных тэкстаў або віншаванняў. Вершы часта выступаюць дапаўненнем нейкіх большых матэрыялаў.

Выключэнне склала публікацыя ў часопісе «Полымя» № 5-6 за 1929 год, дзе прадстаўлена нізка вершаў паэта амаль на трыццаць старонак. Гэтыя вершы больш паэтычныя і вобразныя, паэтыка больш уласцівая ранняй творчасці Купалы. Але да вершаў ёсць адна вельмі значная пазнака: «Прыводзячы ў парадак свае старыя архівы, я знайшоў сярод рукапісаў друкуемыя тут вершы, якія раней па цэлым шэрагу прычын, у тым ліку і цэнзурным, нідзе не друкаваліся» [18, с.70]. Гэта пазнака ўказвае адразу на некалькі дэталяў жыцця аўтара, што адразу змяняе і стаўленне да яго, яго імідж. Так з гэтай прадмовы мы разумеем, што, калі аўтар пачаў друкаваць старое, то новага ён больш не піша (выключэнне мы бачылі ў «службовых» вершах). Гэта можа сведчыць пра ціск на аўтара, што выклікае шкадаванне да яго, а тым самым змяняе яго асяроддзевы імідж. Другое, што нам становіцца вядома з прадмовы – гэта тое, што аўтар падпадаў пад дзеянне цэнзуры, што падмацоўвае першую эмоцыю ў дачыненні да аўтара.

У 1932 годзе ў часопісе «Беларусь калгасная» з'яўляецца верш Янкі Купалы, прысвечаны калгаснай тэматыцы [20, с. 23]. У вершы з'яўляецца большая вобразнасць, але паэт ужо не звяртаецца да сялян, а вобразна выяўляе працэсы, якія адбываюцца ў калгасе. У выданні прадстаўлены толькі адзін верш, і той ніякім чынам не выдзелены і больш не перадае аўтарскай індывідуальнасці Янкі Купалы. Персанальны іміджмейкінг перастае працаваць, бо і вершы, і асоба аўтара выконваюць зараз выключна службова-ідэалагічную функцыю, што павышае імідж камуністычнай партыі і савецкай дзяржавы.

У 6-7 нумары гэтага ж выдання мы заўважаем, што Янку Купалу прысвечана цэлая частка нумара [7, с. 3]. Прычынай таму стаў юбілей паэта. На першай старонцы выдання размешчаны фотаздымак Янкі Купалы на ўсю старонку. Фота фарміруе габітусны імідж паэта як сталага, сур'ёзнага і мэтанакіраванага чалавека – бо калі раней паэт натхнёна глядзеў у прастору паўз фатографа, то зараз ён засяроджана пазірае ў аб'ектыў, апрануты ў пінжак, кашулю і гальштук. Асаблівы эфект фота надае чорны фон – ён робіць фота больш сур'ёзным.

Далей мы бачым службовыя вершы паэта, прысвечаныя перамозе над белапалякамі. Гэта сведчыць пра тое, што, нягледзячы на юбілей і вялікую ўвагу да паэта, яго роля ў бягучым літаратурным працэсе працягвае быць ідэалагічнай, безасабовай. З беларускага народнага песняра паводле іміджу ён ператвараецца ў пралетарскага пісьменніка савецкай Беларусі. Гэта пацвярджае віншавальны зварот рэдакцыі часопіса, а таксама верш Петруся Броўкі, прысвечаны паэту [1, с. 6]. У абодвух тэкстах падкрэсліваецца, што галоўная заслуга Янкі Купалы – ухваленне пралетарскіх парадкаў, якое ён пачаў ажыццяўляць толькі ў апошнія некалькі гадоў. У зваротах ні слова не сказана пра беларускі народ і звароты Янкі Купалы да яго, уся творчасць паэта зводзіцца да рэалізацыі мэт дыктатуры пралетарыяту.

Гэта ўсё сведчыла пра пераарыентацыю дзелавога іміджу Купалы ў рэчышча праграмы кіруючай партыі. У параўнанні з нумарам, прысвечаным Якубу Коласу, частка нумара з віншаваннямі Янку Купалу значна меншая і цалкам зведзена да ідэй пралетарыяту, а не асвятлення жыцця і творчасці паэта, што яшчэ больш сцірае яго імідж народнага песняра, у тым ліку – абаронцы беларускага селяніна. Таксама трэба сказаць, што ў тым юбілейным годзе названая публікацыя засталася ці не адзіным творчым з'яўленнем пісьменніка ў друку, і вершы Купалы тут былі ўжо залішне кароткія і простыя па рыфмах і мастацкіх сродках.

Адзін з самых паказальных (у плане змены іміджу Купалы) тэкстаў пра паэта выходзіць у 1934 годзе ў часопісе «Полымя рэвалюцыі». У крытычным артыкуле «Становішча і перспектывы развіцця сучаснай беларускай паэзіі» Алесь Кучар разглядае паэму Янкі Купалы «Над ракою Арэсай» [25, с. 148]. У сваім артыкуле аўтар ухваляе твор Янкі Купалы, але ўдакладняе, што сапраўды мастак павінен зразумець і палюбіць сацыялістычныя ідэі. А таксама кажа, што «Гэтыя буржуазныя нацыяналісты спрабавалі спекуляваць часамі і імем Янкі Купалы…», і што паэма «Над ракою Арэсай» з'явілася ў выніку рэзкай крытыкі з боку партыі і пралетарскай грамадскасці нацыяналістычных памылак Янкі Купалы»; «На прыкладзе паэмы мы бачым, наколькі ідэйна і мастацкі вырас Янка Купала і менавіта таму, што ён павярнуўся да багатай і шматграннай рэвалюцыйнай сацыялістычнай рэчаіснасці. Асноўныя рысы творчасці Янкі Купалы выявіліся ў яго лепшых рэвалюцыйных творах, што напісаны ім пасля рашучага паварота ад буржуазнага нацыяналізма да сацыялістычнага будаўніцтва» [25, с. 149].

У гэтым артыкуле мы бачым відавочнае абвінавачанне Янкі Купалы ў нацыяналізме, што фактычна рэзка адмоўна ўплывае на ранейшы імідж народнага пісьменніка. Аўтар указвае, ад якога моманту Янку Купалу можна лічыць добрым пісьменнікам, а да якога часу яго творчасць была цалкам памылковай. А ўхваленне яго пралетарскіх твораў робіць імідж паэта цалкам сацыялістычным, правільным. Фактычна, трактуецца, што толькі пераход да ідэй сацыялізму зробіць вас сапраўдным паэтам.

Але і пасля ўхвальнага разбору паэмы Алесь Кучар знаходзіць у ёй «палітычныя памылкі», што зноўку адмоўна ўплывае на імідж пісьменніка. Кучар кажа, што Янка Купала пасіўна ставіцца да ідэй камунізму і не ўдзельнічае ў будаўніцтве новай дзяржавы. Такі чынам атрымліваецца, што артыкул пачынаецца і заканчваецца цяжкімі абвінавачваннямі, што моцна псуе не толькі імідж сялянскага паэта, але і імідж Янкі Купалы як паэта ўвогуле.

У 1937 годзе ў гэтым жа часопісе выходзіць яго верш «Аб Сталіне сейбіту» [6, с. 3], дзе паэт выказваецца аб І. Сталіне як аб лепшым кіраўніку, чымсьці ў вобразах прыроўніваючы яго да Бога. Верш носіць адыёзны характар і цалкам стварае імідж Сталіну, але ніякім чынам не выяўляе тую асобу Янкі Купалы, якая паспела ўжо зрабіцца знакавай не толькі для беларусаў, але і ўсёй плыні класічнага славянскага рамантызму ў першай трэці XX стагоддзя.

У перыяд з 1938 года і да вайны з Гітлерам творчасць Янкі Купалы была зусім нешматлікай, пераважна безасабовай, паэт рэдка выступаў у перыядычным друку, часта з адзіночнымі вершамі пралетарскага характару, займаўся мастацкім перакладам. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны пачаў актыўную антыфашысцкую працу, у якой ізноў звярнуўся да беларускага народа. Пасля смерці паэта гэта паспрыяла вяртанню яго іміджу беларускага нацыянальнага класіка. А ў часы дэактуалізацыі ідэй сацыялізму – выкрышталізаваць беларускую нацыянальную ідэю з творчасці Янкі Купалы.

Такім чынам, прааналізаваўшы даныя, атрыманыя з беларускага перыядычнага друку 1920–1930-х гг., можна зрабіць вывад, што імідж Янкі Купалы і яго прадстаўленне ў другой палове жыцця класіка былі шчыльна звязаны з палітычным кірункам у дзейнасці камуністычнай партыі. У часы актыўнай беларусізацыі Янка Купала з'яўляецца на першых старонках самых вядомых беларускіх газет і часопісаў як пясняр беларускага сялянства, беларускай нацыянальнай ідэі, як настаўнік і прыклад для маладога пакалення.

Янка Купала звяртаецца да розных сацыяльных груп, абараняе ідэі самавызначэння беларускага народа ў час распаду Расійскай імперыі. Бліжэй да 1927 года значэнне асобы Янкі Купалы з пункту гледжання актуальнай палітычнай кан'юнктуры ў Савецкай Беларусі пачынае зніжацца: яго сатырычныя і гумарыстычныя вершы ўспрымаюцца як анекдоты, а на творчасць пішуцца адмоўныя водгукі. Пасля абвінавачвання Янкі Купалы ў нацыяналізме колькасць і якасць яго ўласных публікацый і матэрыялаў пра яго ў друку рэзка падае, набывае фармальны, службовы характар. Арыгінальныя публікацыі творчага характару амаль знікаюць.

Разглядаючы гэтыя працэсы ў кантэксце стварэння і функцыянавання пісьменніцкага іміджу, можна сказаць, што найбольшы росквіт і папулярнасць Янкі Купалы былі дасягнуты ў часы рускіх рэвалюцый, распаду Расійскай імперыі, беларусізацыі, – прыкладна да 1927 года: тады імідж асобы пісьменніка развіваўся інтэнсіўна і шматбакова, адлюстроўваючы яго рэальнае

насычанае жыццё і росквіт творчага генія. Замацаваліся розныя рысы і якасці іміджу, ад габітуснага да асяроддзевага. У далейшым, пад ціскам гістарычных умоў, асоба паэта адыходзіць на другі план у публічнай прэзентацыі яго вобраза ў СМІ сталінскіх часоў. Паэт ператвараецца ў рупар партыйна-сацыялістычных ідэй, а ў далейшым і ўвогуле знікае. Вершы перастаюць раскрываць творчы свет аўтара, выяўляць яго пазіцыі. Паэт тэхнічна апісвае тое, што трэба апісваць. І новы штуршок натхнення прыходзіць да паэта, калі ідэі партыі і яго асабістыя ідэі сыходзяцца ў часы Вялікай Айчыннай вайны.

Сродкамі фарміравання іміджу ў часы жыцця і творчасці Янкі Купалы выступаюць: вершы яго і пра яго, звароты, крытычныя артыкулы, фотаздымкі, кампазіцыйная пабудова яго прэзентацыі ў друкаваных выданнях і іншае. Абапіраючыся на гэтыя матэрыялы, можна сказаць, якое стаўленне ў розныя гістарычныя часы мелі да пісьменніка прадстаўнікі партыі і рэдакцый. Самым яскравым сродкам стварэння іміджу пісьменніка выступалі непасрэдна яго творы і частата іх публікацый. Зніжэнне якасці твораў і радзейшы выхад у друк прывялі да таго, што іміджмейкінг паэта ў перыяд 1930-х гг. страціў сілу. Істотную ролю ў гэтых зменах адыграла і кампазіцыйная пабудова нумароў з матэрыяламі, датычнымі Янкі Купалы. Так, у самыя неспрыяльныя для паэта часы можна заўважыць тэндэнцыю да адсоўвання яго твораў у глыб нумара і пазбаўленне іх «самастойнасці»: яны рабіліся дадаткам да іншых твораў.

Таксама трэба заўважыць, што ўсе змены ў іміджмейкінгу паэта адбываліся выключна пад уздзеяннем знешніх абставін: заняпад і пераўтварэнне іміджу Янкі Купалы звязаны толькі з палітычным курсам краіны і ўціскам на асабістыя погляды паэта.

### Бібліяграфічны спіс


1. Броўка, П. Янку Купалу / П. Броўка // Беларусь калгасная. – 1932. – № 6-7. – С. 6–8.
2. Бурдзьё, П. Поле литературы / П. Бурдзьё // Новое лит. обозрение. – 2000. – № 45. – С. 22–87.
3. Бязлепкіна, А. Нацыянальная традыцыя і канструяванне іміджу пісьменніка / А. Бязлепкіна // Слова ў кантэксце часу: да 80-годдзя Аркадзя Іосіфавіча Наркевіча: зб. навук. прац / Мін-ва адукацыі Рэсп. Беларусь, Беларус. дзярж. ун-т, Ін-т журналістыкі, каф. стылістыкі і літ. рэдагавання; пад агул. рэд. В. І. Іўчанкава. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2009. – С. 81–88.
4. Капцев, В. А. «Медийность» как отличительная черта образа современного писателя / В. А. Капцев // Русская и белорусская литературы на рубеже XX–XXI вв.: сб. науч. статей: в 2 ч. / под ред. С. Я. Гончаровой-Грабовской. – Минск: РИВШ, 2010. – Ч. 2. – С. 77–81.
5. Крапіва, К. Ці то – здольны пясняр, ці то – модны пляткар… / К. Крапіва // Маланка. – 1927. – № 3. – С. 2.
6. Купала, Я. Аб Сталіне сейбіту / Я. Купала // Полымя рэвалюцыі. – 1937. – № 11. – С. 3–4.
7. Купала, Я. Адзінаццаць месяцаў / Я. Купала // Беларусь калгасная. – 1932. – № 6-7. – С. 3–5.
8. Купала, Я. Акоў паломаных жандар... / Я. Купала // Надзвінне. – 1926. – № 1. – С. 7–9.
9. Купала, Я. Арлянятам / Я. Купала // Маладняк. – 1923. – № 1. – С. 10–11.
10. Купала, Я. Безназоўнае / Я. Купала // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 22–26.
11. Купала, Я. Беларускаму дзяржаўнаму выдавецтву 1924–1925 / Я. Купала // Чырв. Беларусь. – 1930. – № 2. – С. 13.
12. Купала, Я. Вам на памяць Серп і Молат… / Я. Купала // Маладняк. – 1924. – № 2-3. – С. 11–12.
13. Купала, Я. Дзве сястры / Я. Купала // Беларус. работніца і сялянка. – 1924. – № 1. – С. 17.
14. Купала, Я. Дыктатура працы / Я. Купала // Чырв. Беларусь. – 1930. – № 1. – С. 11.
15. Купала, Я. Крым / Я. Купала // Радавая рунь. – 1924. – № 1. – С. 1.
16. Купала, Я. Ліст да палачан народнага паэта Беларусі Янкі Купалы / Я. Купала // Надзвінне. – 1926. – № 1. – С. 10.
17. Купала, Я. Наш летапісец / Я. Купала // Полымя. – 1924. – № 4. – С. 17.
18. Купала, Я. Недрукаваныя дарэвалюцыйныя творы / Я. Купала // Полымя. – 1929. – № 5-6. – С. 70–92.
19. Купала, Я. Нікому / Я. Купала // Чырв. сейбіт. – 1926. – № 1. – С. 2–4.
20. Купала, Я. Новая восень / Я. Купала // Беларусь калгасная. – 1932. – № 1. – С. 23.
21. Купала, Я. Памяці Шаўчэнкі / Я. Купала // Маланка. – 1926. – № 6. – С. 2.

22. Купала, Я. Святая праўда / Я. Купала // Авадзень. – 1925. – № 1. – С. 3.
23. Купала, Я. Тутэйшыя / Я. Купала // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 34–74.
24. Купала, Я. Тутэйшыя / Я. Купала // Полымя. – 1924. – № 3. – С. 3–36.
25. Кучар, А. Становішча і перспектывы развіцця сучаснай беларускай паэзіі / А. Кучар // Полымя рэвалюцыі. – 1934. – № 1. – С. 148–156.

*УДК 821.161.3.09(092 Я. Колас, В. Рагойша)*

# З ТВОРЧЫХ КАНТАКТАЎ ЯКУБА КОЛАСА: РЭЦЭПЦЫЯ АСОБЫ ПІСЬМЕННІКА Ў ДАСЛЕДАВАННЯХ ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦАЎ БДУ

**В. К. Мароз**

*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*
*tak_tav@tut.by*

У артыкуле прасочана шматварыянтнасць прачытання і інтэрпрэтацыі твораў медытатыўна-роздумнага характару ў жанравай палітры лірыкі ваеннага часу народнага паэта Якуба Коласа (паводле кнігі доктара філалагічных навук прафесара В. П. Рагойшы «Мой Трыглаў», 2012).

*Ключавыя словы:* рэцэпцыя асобы; жанры лірыкі; творы ўслаўленча-заклікальныя; сатырычна-выкрывальныя; медытатыўна-роздумныя; аповедныя.

# CREATIVE CONTACTS OF YAKUB KOLAS: RECEPTION OF THE PERSON OF THE WRITER IN THE RESEARCH OF BSU LITERATURE SCHOLARS

**V. K. Maroz**

*The Center for the Belarusian Culture, Language and Literature Research*
*of the National Academy of Sciences of Belarus*
*Minsk, Republic of Belarus*
*tak_tav@tut.by*

The article traces the multivariate reading and interpretation of works of a meditative-contemplative nature in the genre palette of the wartime lyrics of the national poet Yakub Kolas (according to the book by Doctor of Philology Professor V. P. Rahoysha “My Triglav”, 2012).

*Key words:* reception of the person; genres of lyrics; laudatory works; satirically-revealing; meditative-contemplative; narrative.

Творчасць Янкі Купалы і Якуба Коласа была пастаянна ў полі зроку літаратуразнаўцаў БДУ [гл.: 1, 2]. Ужо ў 1920-я гг. Коласавы творы даследавалі І. Замоцін, А. Вазнясенскі, М. Піятуховіч, А. Бабарэка і інш. Асабліва значным быў уклад у коласазнаўства вучоных БДУ ў другой палове XX ст., калі пабачылі свет манаграфіі і даследаванні М. Ларчанкі, С. Александровіча, І. Навуменкі, А. Лойкі, Л. Фіглоўскай і інш. С. Александровіч – аўтар кніг пра жыццё і творчасць Якуба Коласа «Ад роднае зямлі…» (1962), «На шырокі прастор» (1972), «Крыжавыя дарогі» (1985), якія створаны ў жанры пісьменніцкай біяграфіі.

Класікі беларускай літаратуры Янка Купала, Якуб Колас, Максім Багдановіч у кнізе артыкулаў і эсэ прафесара Вячаслава Рагойшы паўстаюць у вобразе літаратурнага Трыглава (па аналогіі з назвай найвышэйшай гары ў Славеніі). У прадмове аўтар патлумачыў: «Але чаму мой Трыглаў? Бо менавіта так я бачу некаторыя аспекты творчасці нашых славутых